15.30 Рыбалка без границ
15.55 Операция Бассет
16.25, 02.50 Мой мир - рыбалка
16.50 Приключения рыболова
17.15 Уральская рыбалка
19.30, 02.20 Морская подводная охота
19.55 Планета охотника
20.25 Меткий выстрел
21.05 Карпфишинг
21.30 Каяк и рыбалка
21.50 Донская рыбалка
22.50 Оружейные дома мира
23.15 Охотничьи меридианы
00.05 В Индийском океане
00.35 Клевое место
03.45 Рыболовное шоу с Мэттом Уотсоном
04.10 Универсальный фидер
04.35 Оружейный клуб
05.05 Большой троллинг

НОВОСТИ

ФЕСТИВАЛЬ ЦВЕТОВ СОБРАЛ МНОЖЕСТВО ГОСТЕЙ

В деревне Желудок Щучинского района прошёл фестиваль цветов.

В выходной день гости смогли в свое удовольствие насладиться множеством цветочных композиций, а также откушать пирогов и печенья в виде цветов, полюбоваться выставкой народного творчества и дефиле девушек в платьях из цветов.

Участницы дефиле не только прошли в своих нарядах по сцене, но и рассказали о том, как они готовили платья к показу.

Особое место на празднике заняли мастер-классы по изготовлению цветочных композиций и плетению корзин.

Для участников праздника местные артисты подготовили концертную программу. Также работала праздничная торговля и было множество развлечений для детей.

Екатерина ЯНУШЕВИЧ
Фото автора


Можно было научиться плести корзины


Интересный экспонат


Фотографировались на подворьях

НА ЖЫЦЦЁВЫХ СКРЫЖАВАННЯХ

ЗАЛАТАЯ ДЗЕЎКА

Пасля вайны ўсім было цяжка, але худому як верацяно і ўчарнеламу Вінцуку Каробчыцу з вёскі Аханяны здавалася, што яму найцяжэй. Жонка Адэля як з рэшата сыпала дзецьмі: па надворку ўжо бегалі пяцёра, а на свет прасілася яшчэ адно. Ды не аб гэтым найбольш балела яго галава. У хаце разам з імі жыла старэйшая жончына сястра Клаўдзя — дзеўка-векавуха. Тут для малодшых жаніхоў не было, а для яе і падаўна.


МАЛЮНАК ЯЎГЕНА ІВАНОВА

От жа бо сёстры! Яго Адэля стройная, як тапалька, чарнабровая, сінявокая, з мілымі ямачкамі на шчоках, а ў Клаўдзі ўсё наадварот. Фігура яе нібы з дубу высечана: шырокая ў косці, мажная. Калі ішла, то так і хацелася нацягнуць на ўсю постаць абручы, каб незнарок не рассыпалася — гэтакая была ў яе цяжкая і нязграбная хада. А на твары рабацiння як усё роўна хто грэчку рассыпаў ды забыўся сабраць. Да таго ж Клаўдзя была блізарукая, ці, як казалі ў вёсцы, нізкая на вочы. Калі яна што-небудзь разглядвала, то падносіла блізка да носу, усё роўна як нюхала.

Але сярод вясковых бабаў Клаўдзя была аўтарытэтам, бо ўмела шыць. Яшчэ перад вайной бацькі аддалі яе вучыцца ў суседнія Конанаўцы да Ванды Чабоцька, якая была добрай майстрыхай. Ну, Клаўдзя, канешне, не Ванда, але ў цяжкі пасляваенны час умела пераліцаваць каптаны для дарослых, перашыць з тых жа каптаноў дзіцячыя палітончыкі. Плату брала невялікую, бо хто табе шмат заплаціць у такі галодны час. Таму Вінцук і лічыў Клаўдзю лішнім ротам і ўсяляк стараўся выпхнуць замуж. Як кажуць, хоць за вала, абы дома не была.

—Яна ж ні халеры не дапамагае мне дома па гаспадарцы! — абураўся ён, калі былі ўдваіх з жонкай. — Ні сенавацъ, ні бульбу капаць — усё адзін, бо табе за дзецьмі няма як. А яна не хоча. Шые яна, ці бачыце! Такая майстрыха, што хоць у парыжскае атэлье мод адпраўляй!

— Не кажы хоць так пры людзях! — папярэджвала Адэля. — Тут і так жаніхі ў чаргу не становяцца...

— Ты што! Я хвалю яе. Кажу, што Клаўдзя — залатая дзеўка, толькі вось мужчыны ўсё адно як паслеплі, ніхто замуж не бярэ.

— Во-во, гэтак і кажы...

Аднойчы восенню, акурат перад капаннем бульбы, да Клаўдзі пасватаўся Міхась Даўгапольскі з далёкай вёскі Акунічы. Ён быў удавец з чатырма дзецьмі. Відны, яшчэ не стары мужчына з кучаравым рудым чубам. Супроць яго Клаўдзя нічога не мела, але як даведалася пра дзяцей...

— Я не буду малым смаркачам насы выціраць! — стала сцяной. — Лепш ужо адной!

— Каб жа адной! — ужо не сцярпеў Вінцук. — А то ж мне на шыю села і ногі звесіла!

Клаўдзя такога не чакала. Яна лічыла сябе самай галоўнай здабытчыцай у сям'і, а тут на табе!

У хаце пачаліся сваркі. Ужо Вінцук не называў швагерку залатой дзеўкай, а ўсё няўдаліцай ды нахлебніцай.

Недзе праз год ім усім вельмі пашанцавала. Ад чыгуначнай станцыі Вераскі, што была за шэсць кіламетраў ад іхняй вёскі, наважыліся класці вузкакалейку да бліжэйшага лесу, каб зрабіць там склад мінеральных угнаенняў, і набіралі рабочых. Пашпартоў тады вяскоўцам не давалі, але ўсім, каго прынялі на работу, іх далі хутка.

Вырвалася з дамашняга палону і Клаўдзя. Усе былі рады. Яна хоць па-ранейшаму жыла дома, але, як цяпер кажуць, мела свой пражытачны мінімум і ў агульны гаршчок не ўзіралася.

А праз два гады, пабудаваўшы тую чыгунку, брыгада падалася на работу ў іншыя мясціны. З імі і Клаўдзя. Іхняя будаўнічая арганізацыя мела ў Мінску рабочы інтэрнат, і ўсім, каму не было дзе жыць, далі там месца.

Так Клаўдзя стала гараджанкай. Яна зрэдку прыязджала ў вёску, і Вінцук ужо не касавурыўся, а садзіў за стол разам з усімі, бо швагерка прывозіла дзецям пачастункі. Новая мінчанка усяляк старалася схаваць сваё калгаснае паходжанне, якога вельмі саромелася. Яна насіла шаўковыя сукенкі, рабіла завіўку, на шчокі клала тоўсты слой пудры, ад чаго яны былі падобныя на гіпсавыя.

— Толькі той чалавек, хто ў Мінску жыве! — грэбліва казала сястры і швагру. — Калупаецеся тут у гнаі, не раўнуючы, як куры, і нічога ў жыцці не бачыце.

— А ты ж што бачыш? — пацікавіўся Вінцук.

— Ну, магазіны, шмат аўтобусаў і нават трамваяў...

— Ну, раз так, то канешне, — хаваючы ўсмешку, згаджаўся ён.

Горад не вёска, і калі Клаўдзі пераваліла за сорак, ёй знайшоўся жаніх — чалавек з іхняй брыгады. Ён быў значна маладзейшы, высокі, зграбны, але з твару вельмі падобны да яе.

— Ён яшчэ ні разу не быў жанаты! — хвалілася Клаўдзя сястры, калі прывезла жаніха пазнаёміць з раднёй. — Васем завуць. Як пажэнімся, абяцалі нам даць кватэру.

Так яно і сталася. Двухпакаёвую кватэру ім далі недзе праз паўгода.

— Як добра! — радавалася Адэля. — На наступнае лета наш Віталік будзе паступаць у тэхнікум, то навошта яму па тых інтэрнатах сноўдацца. Да Клаўдзі з Васем пойдзе жыць.

Сказала пра гэта сястры. А тая ад варот паварот:

— Яшчэ чаго! У цябе дзяцей плойма, усе вучыцца захочуць, і ўсе, думаеш, у мяне жыць будуць?! Нам з Васем спакой патрэбен, а не з тваімі дзецьмі валэндацца.

— А памятаеш, як ты жыла з намі на ўсім гатовенькім? Я нават тваю бялізну мыла.

— Пайшла ты, курыца калгасная!

Сёстры пасварыліся назаўсёды. Ужо і дзеці ў Адэлі і Вінцука даўно павырасталі. Хто жыў у Мінску, хто вярнуўся ў сваю вёску, але ўсе яны пра цётку Клаўдзю і слухаць не хацелі. І яна ў іх не мела патрэбы. Пахаваўшы ў мінулым годзе мужа, бавіць дні адна. Як пайшла на пенсію, кінулася да Бога. І гады, і цяжкая работа сагнулі яе ў кручок.

На аўтобусным прыпынку адной мінскай вуліцы амаль кожную раніцу можна ўбачыць постаць старой у чорнай хусцінцы. Гэта Клаўдзя Сітнік едзе ў касцёл маліцца. Аднойчы яе ўбачыла вясковая кабета Ірына Верасоўская і расказала Адэлі.

— Пастарэла Клаўдзя... Казала, добра жыве, толькі адзінока вельмі...

— Ніхто ёй не вінаваты... Усё жыццё толькі сябе любіла, толькі пра сябе клапацілася. Дык што ж яна цяпер хоча? І такая ўпартая! Хоць бы калі пісьмо напісала ці прыехала, то дзе ты бачыла! Можа, часам адрас яе маеш, можа, дала яна табе?

Ірына пакапалася ў кашальку, дзе разам з грашамі ляжалі розныя паперкі, і працягнула Адэлі невялічкі лісток.

— Вось яе тэлефон...

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ

СОСЕДИ

ТАМ БЕЗРАБОТНОМУ ПЛАТЯТ 325 ЕВРО

Слонимские активисты в рамках программы культурного обмена по приглашению литовской стороны посетили недавно город Друскининкай.

Друскининкай в советское время был городом-курортом всесоюзного значения. Но после развала Советского Союза город пришел в упадок, как и многие города бывшего СССР. До 2000 года безработица здесь составляла 35%. Но в начале XXI века город расцвел благодаря финансовой поддержке Евросоюза и умелым действиям руководства города в самоуправлении. Предпринимателям на тендерной основе были предложены различные недвижимые объекты, которые сдаются им в аренду на 99 лет. В случае расторжения договора городское самоуправление будет обязано выплатить не только вложенные денежные средства в реконструкцию того либо иного объекта, но и до истечения 99 лет выплачивать прибыль, которую получал бы данный предприниматель.

Население города насчитывает 25 000 граждан, а его годовой бюджет составляет 20 миллионов евро, и тратятся деньги только на нужды города. Развивается инфраструктура, построен аквапарк, горнолыжная трасса, оздоровительные учреждения-лечебницы и многое другое. И заметьте, что возвращать вложенные денежные средства Евросоюза не надо, так как это не кредиты и не долги.

На данный момент безработица в Друскининкае составляет 12%. Однако многие неработающие жители просто не нуждаются в работе, поскольку они зарабатывают деньги самостоятельно, благодаря приграничной зоне. Для нуждающихся в жилье малоимущим предусмотрено социальное жилье. Решением Сойма принята программа дотации съемного жилья, а пособие по безработице составляет 325 евро в месяц.


Белорусская делегация в Друскининкае

Развиваются неправительственные организации. Создаются ассоциации инвалидов. Также работают центры помощи детям-инвалидам, и помощь оказывается реальная.

Виктор МАРЧИК
Фото из архива автора

РЭДКІЯ ЛЮДЗІ

СВЯТЛО ЛЮБОВІ

Ён нарадзіўся ў польскай вёсцы Дутраў у вялікай сям'і. Бацькі працавалі на зямлі, і Здзіслаў, як падрос, вырашыў ім дапамагаць, таму пасля заканчэння школы паступіў вучыцца на механіка сельскагаспадарчых машын.

Колькі сябе памятае, як і ўсе Пікулы, хадзіў маліцца ў касцёл. І аднойчы, слухаючы шчырую пропаведзь святара пра дабрыню, пра любоў да Бога і людзей, вырашыў стаць ксяндзом. Ён атрымаў спецыяльнасць механіка і адразу ж паступіў у духоўную семінарыю Селезіянцаў Святога Яна Боска. Было гэта амаль 45 гадоў таму.

— Як стаў клерыкам, вырашыў паехаць місіянерам у далёкія Эквадор і Балівію, каб вучыць тамтэйшых жыхароў маліцца, жыць па боскіх законах, — успамінае ксёндз Здзіслаў Пікула.

Але, каб мець стасункі з тамтэйшымі жыхарамі — індзейцамі, яму прыйшлося вывучыць тры мовы: іспанскую, кэчула і аймара. І рабіць гэта не ў якой-небудзь навучальнай установе, а ў штодзённым жыцці.

— Вывучыць мовы мне дапамаглі дзеці, з якімі я праводзіў шмат часу, хадзіў з імі на паляванне, — кажа ксёндз. — А паляванне там, бадай, самы галоўны занятак, бо калі не здабудзеш ежу, то як жа пражывеш?

Напачатку мне было дзіўна бачыць, як індзейцы ходзяць амаль голыя, што яны не ведаюць, які дзень, якая гадзіна. Павінен сказаць, што ўвогуле яны людзі добрыя, але калі ім не спадабаешся… Мне ўдалося з імі паладзіць і нават пасябраваць. Я вучыў іх маліцца, расказваў пра рэлігію, рыхтаваў да хрышчэння дзяцей.

Умовы жыцця там, канешне, не для еўрапейца, але прывыкнуць да ўсяго можна. Днём вельмі горача, тэмпература падымалася да сарака градусаў, а ноччу апускалася да нуля. Таму, каб не замерзнуць і не прастудзіцца, мы нанач закопваліся ў нагрэты за дзень пясок. Так і спалі. Аднойчы мяне ўкусіла змяя, абарыгены ледзь выратавалі.

Харчаваліся чым давядзецца, нават пацукоў елі, як не было нічога лепшага. Не далікатэс, вядома, але куды дзенешся: голад не цётка. Я пахудзеў там больш як на палову.

Пяць гадоў прабыў клерк Здзіслаў Пікула ў тых далёкіх краях. І так прывык, што нават ад'язджаць не хацелася. А ад'язджаць трэба было, каб закончыць вучобу ў семінарыі і стаць ксяндзом.

Ён вельмі шкадаваў людзей, якіх пакідаў у тых далёкіх краінах. І яны не хацелі з ім развітвацца, прасілі калі-небудзь вярнуцца назад. Дзеля гэтага па іхняй просьбе мусіў пакінуць на пяску адбітак сваіх слядоў: па іхнім меркаванні, верная прыкмета таго, што абавязкова вернецца.



Вернікі ўшанавалі Найсвяцейшую Панну

— Як прыехаў туды, падабраў маленькага сабачку. За пяць гадоў ён вырас так, што стаў падобны на мядзведзя. Дык вось, калі сеў у верталёт і ён пачаў набіраць вышыню, убачыў, як мой верны сабака што ёсць сілы бяжыць па зямлі, стараючыся дагнаць машыну ў небе. Мне так сціснула сэрца, што з вачэй пакаціліся слёзы. Было жаданне выскачыць і назаўсёды застацца на гэтай зямлі, да якой прырос душой, — кажа ксёндз.

Закончыўшы вучобу ў Польшчы, ён стаў святаром і неўзабаве прыехаў у Беларусь, у вёску Варняны Астравецкага раёна. Шмат добрых успамінаў пакінуў там пра сябе, а яго душу заўсёды будуць саграваць цяпло і сардэчнасць тамтэйшых людзей.

Жыццё бяжыць, уносіць, так бы мовіць, свае папраўкі ў людскія лёсы. Так і ў ксяндза Здзіслава Пікулы: яшчэ года няма, як ён пераехаў з Варнянаў у Дзятлава, і цяпер служыць у парафіі Унебаўзяцця Найсвяцейшай Панны Марыі. Гасцінна і прыязна сустрэлі яго тут, з вялікай надзеяй на тое, што рамонт касцёла, які цягнуўся доўгі час, будзе нарэшце завершаны, што ў жыцці парафіян будзе нейкая жывінка, навізна. І ён апраўдаў гэтыя надзеі. Яшчэ зусім мала часу прайшло, а тут адбыліся вялікія змены. Напрыклад, завяршаецца рамонт касцёла. Засталося толькі памаляваць вежы, дах, асвятліць крыжы. А ў недалёкай будучыні ля касцёла пакладуць плітку, пасадзяць дэкаратыўныя дрэвы, зробяць кветнікі. Будзе зроблены рамонт касцёла ўсярэдзіне і капліцы, што на дзятлаўскіх могілках.

У канцы мая прайшла ўрачыстасць успамогі хрысціян. Прыязджаў ксёндз-біскуп Юзаф Станецкі. Вернікаў сабралася столькі, што не памясціліся ў вялікім будынку касцёла, многія стаялі на двары. Было шмат святароў з розных куткоў Беларусі.

Вельмі хораша і ўрачыста адбыўся тут Сакрамант бежмавання, на які прыязджаў ксёндз-біскуп Аляксандр Кашкевіч. Так бы мовіць, віноўнікамі ўрачыстасці былі і вельмі маладыя людзі, і тыя, хто даўно жыве на зямлі. Некаторых нават прывозілі ў інвалідных калясках.

Ксёндз Здзіслаў арганізаваў аратoрыі для моладзі, дзе яе выхоўваюць у веры і навучаюць рэлігіі. Ужо падрыхтаваны дзеткі да першай камуніі і адбылося прысвячанае гэтаму набажэнства. Дапамогу ксяндзу аказаў клерк Артур, які нейкі час жыў у Дзятлаве, а таксама сёстры з манастыра.

Вялікую падтрымку аказваюць і прыхаджане. Яны прыбіраюць у касцёле, ствараюць утульнасць. Працуе касцельны камітэт.

На тэрыторыю, дзе жыве ксёндз, хораша зайсці, гэта проста нейкі райскі куток: шмат кветак, зробленыя з пластыку буслы. Ёсць нават маленькая сажалка. І ўсё гэта зроблена пры ксяндзу Здзіславу за дзевяць месяцаў.

Ён вельмі хораша і ўрачыста праводзіць хрышчэнне дзетак, дае шлюб маладым. Яго пропаведзі, з якімі звяртаецца да прыхаджан, поўныя светлай любові да Бога, радзімы, людзей.

За невялікі прамежак часу ксёндз Здзіслаў здабыў у мясцовых жыхароў вялікую павагу сваім шчырым служэннем Богу, пашанай да кожнага чалавека, спагадай і разуменнем.

— Я дзякую людзям, кіраўніцтву Дзятлаўскага раёна за дапамогу і падтрымку ва ўсіх добрых справах, — кажа ксёндз Здзіслаў Пікула. — Вельмі люблю Беларусь і хацеў бы пражыць тут свае апошнія гады і тут памерці. А калі не, то вярнуся ў Балівію ці Эквадор і памру там.

А я ўпэўнена, шаноўны ксёндз Здзіслаў, што Вы пакінулі добры след і ў сэрцах цёмных скурай, але светлых душой індзейцаў…

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ

ПОСЛЕСЛОВИЕ

Артём Гомелько не смог сдержать атакующего футболиста

МЯЧИ ВЛЕТАЮТ «НА ФЛАЖКЕ»

Что-то не выдерживает слонимская команда 90 игровых минут на поле. В этом сезоне уже 9 мячей (а это третья часть) пропущено в последнюю десятиминутку матчей.

К тому же еще 6 мячей в этом году влетело в сетку ворот «Слонима» в период с 83-й по 92-ю минуту в трех кубковых поединках.

Если же брать все сезоны в первой лиге, то коллектив города имеет на своем счету уже 110 голов, которые были забиты нашим вратарям на последних минутах игр (с 81-й по 90+4). Самым неудачным (пока) являлся сезон 2013 года, когда 10 подобных мячей пропустили П.Шишея (6), Е.Мялик (2) и С. Курганский (2). Причем Павел, сыгравший в команде всего в шести поединках, доставал мяч из своей сетки в том числе и на 82-й, 87-й, 91-й (3 раза) и 92-й минутах.

В нынешнем сезоне в концовке встреч трижды пропускал Д.Савинков и 6 раз — А.Гомелько. Больше всех мячей за один сезон «на флажке» доставал из ворот В.Канашевич (8). Столько же пропущенных голов имеет Д.Аснин (правда, за 5 сезонов в «Коммунальнике»). Больше всего мячей на финише матчей забивали С.Бергу — 18 (в 6 чемпионатах) и И.Кривецкому — 11 (в 3 чемпионатах).

Всего 25 слонимских голкиперов вынимали мячи из сетки, забитые в заключительные десятиминутки игр. Есть среди них и защитник Н.Дым, вставший в ворота после удаления Ю.Короля в 1996 году.

Александр ЗАХАРЕНКО
Фото www.fcshakhter.by

КАРАТЭ

КАРАТИСТОВ БЛАГОСЛОВИЛИ НА УСПЕХ

В Жировичах состоялся летний сбор инструкторов Белорусской республиканской федерации Киокушинкай каратэ «ИКО 1», в котором участвовали 16 инструкторов из Гродно, Слонима, Минска, Дятлово и Новогрудка.

Специалисты подвели итоги за прошедший год, проанализировали работу в системе развития Киокушинкай каратэ в Беларуси и спланировали свою деятельность на 2016 спортивный год.

Перед отъездом спортсмены получили благословение от владыки Жировичского монастыря на участие в XI чемпионате мира, который будет проходить в Токио с 20 по 23 ноября 2015 года.

Екатерина ЯНУШЕВИЧ
Фото Василий МАКСИМОВ



Спортсмены, которые приняли участие в сборах

СПОРТИВНЫЙ ОТДЫХ

ФУТБОЛЬНОЕ ЛЕТО «ИГРОВИКА»

С приходом лета каждый ребёнок находит для себя занятие по интересам. В ДЮСШ №1 впервые, помимо первой смены спортивного лагеря, была организована ещё одна — третья. Ребята и их родители с огромным желанием согласились участвовать в подобном мероприятии.



Тренировка



Третья смена немного отличается от первой. Если в июне в отрядах было несколько видов спорта, а это борьба, бокс, гимнастика, гандбол, то в августе собрались только юные футболисты.

Ребята под руководством тренеров Руслана Корнева, Андрея Талерчика, Андрея Молчанова совершенствуют свои навыки обращения с мячом, получают физическую и специальную нагрузку, которая так необходима при становлении молодого организма и вливании в атмосферу профессионального спорта.

Младшие ребята 2005-2006 гг. рождения ведут подготовку ко второму кругу PatricKids League, которая стартует в конце августа в Минске. Юноши 2002 и 2003 гг. рождения проходят подготовительный период в преддверии старта областного первенства. Футболисты 2000 и 2001 гг. готовятся к старту в республиканском юношеском первенстве среди команд первой лиги.

Утро в лагере начинается с построения и зарядки, затем у ребят наступает свободное время, которого не так уж и много. На протяжении дня юные футболисты посещают тренажёрный зал, спортивный уголок, играют в теннис и баскетбол. В самые жаркие дни занятия проходили на Лобазовском озере, в остальном следуют по маршруту спорткомплекс — стадион «Газпром трансгаз Беларусь» — спорткомплекс. На стадионе с искусственным покрытием ребята осваивают технические приёмы, а также знакомятся с тактикой.

Самые старшие спортсмены провели товарищеский матч со своими сверстниками из Барановичей — игра завершилась вничью 2:2 (дважды отличился Дмитрий Ремез). В последние дни лагеря состоятся личные первенства и эстафеты.

Егор ЖИГАЛИК
Фото автора

ПЛЯЖНЫЙ ВОЛЕЙБОЛ

НА ИГРУ ЗАЯВИЛОСЬ ЧЕТЫРНАДЦАТЬ КОМАНД



Команды-призёры



На протяжении прошедших выходных в Слониме на пляже Лобазовского озера проходили традиционные соревнования по пляжному волейболу среди команд по месту жительства.

В состязаниях участвовали пять женских и девять мужских команд. Чтобы выяснить, кто сильнее среди женщин, команды играли между собой по кругу. А мужские команды поделили на три группы. Победители каждой группы сыграли между собой.

По итогам соревнований среди женских команд первое место заняла команда «Чайки», вторыми стали девушки из команды «Пума», а третье место досталось команде «Фета».

Среди мужских команд места распределились следующим образом: победу в соревнованиях одержала команда «Бобры», второе место заняли мужчины из команды «Оскар», третье место досталось мужчинам из «ДДС».

Екатерина ЯНУШЕВИЧ
Фото автора

ФУТБОЛ. ПЕРВАЯ ЛИГА

НЕУДАЧНЫЙ ВЫЕЗД

ФК «Сморгонь» — ФК «Слоним» 5:1 (1:0)
16 августа. Сморгонь. Стадион «Юность». 850 зрителей.
Судья — П.Коронец (Жодино).
Голы: 1:0 — Кривобок, 27 с пенальти; 2:0 — Калинин, 61; 2:1 — Красий, 71; 3:1 — Кривобок, 74; 4:1 — Крот, 88; 5:1 — Калинин, 90+1.
Слоним: Гомелько — Снопко (к), Жуков, Михновец (Холодков, 63), Щербаков, Пузач, Гречиха, Красий, Глебов, Бальбух (Берг Влад, 81), Шаков (Герасимчик, 76).
Тренер — Алексей Шубенок.



В первом круге в Слониме команды разошлись миром 1:1 (А. Толканица, В. Шаков). Нынешняя игра до первого взятия ворот проходила на равных.

У гостей два голевых момента имел Щербаков. В первом случае Михаил, имея свободное пространство для завершения атаки, слабо ударил по цели — защитники хозяев сумели спасти ворота от неминуемого гола. Во втором случае Щербаков вместо передачи решил улучшить позицию, но попал в объятия соперников.

Настал черёд атаковать хозяев. Их ударам не хватало точности, пока дело не дошло до пенальти. Александр Красий беспардонно обошёлся с нападающим соперника, свалив его на газон с помощью рук. Пенальти — 1:0. Перерыв.

Вторая половина игры началась с атак гостей, но ничего опасного они не сумели создать у ворот ФК «Сморгонь». Хозяева постепенно прибрали игру «к своим ногам», и почти каждая атака завершалась ударом.

При счёте 2:0 слонимчанам удалось отквитать один мяч. К атаке подключился Александр Красий — после подачи с углового Максима Гречихи он точно направил мяч в ворота соперника. Казалось, гости взвинтят темп игры и пойдут вперёд отыгрываться. Так и было. Только после ошибки Вадима Бальбуха, который подарил мяч сопернику, получили баранку в свои ворота.

Исправить ситуацию у гостей не удалось, а в концовке встречи ещё дважды пришлось начать игру с центра поля.

Егор ЖИГАЛИК

Результаты 17-го тура
Сморгонь – Слоним – 5:1
Крумкачы (Минск) – Кобрин – 3:0
Речица – Ислочь (Минский р-н) – 0:4
Барановичи – Смолевичи – 1:2
Звезда» (Минск) – Днепр (Могилёв) – 0:2
Лида – Берёза – 1:2
Гомельжелдортранс (Гомель) – Городея – 2:3
Химик (Светлогорск) – Орша – 4:0.

ВЫЕЗДНАЯ ПОДПИСКА НА 4-Й КВАРТАЛ 2015 ГОДА



28.08.2015
10.00-11.00 ДЕРЕВНАЯ
11.15-11.45 НОВОСЕЛКИ
12.00-12.30 ВИШЕВО
12.50-13.30 ВЫСОЦК

4.09.2015
10.00-11.00 ДЯТЛОВО
11.30-13.00 КОЗЛОВЩИНА
13.20-13.40 ПАВЛОВО
13.45-14.00 НОВОСЕЛКИ
14.10-14.20 ТАЛЬКОВЩИНА

11.09.2015
9.30-09.50 ОЗГИНОВИЧИ
10.10-10.40 МЕЛЬКАНОВИЧИ
11.00-11.10 ОСТРОВО
11.20-11.30 МИЖЕВИЧИ
11.40-11.50 ПАСИНИЧИ
12.00-12.50 СЕЛЯВИЧИ
13.00-13.10 Б.КРАКОТКА
13.30-14.00 ОЗЕРНИЦА
14.20-14.40 ЕЛКА

18.09.2015
9.30-09.50 ШИЛОВИЧИ
10.00-10.20 ЖИРОВИЧИ
10.40-11.10 ПАРТИЗАНОВКА
11.20-11.40 НОВОДЕВЯТКОВИЧИ
12.00-12.20 СУРИНКА
12.30-12.50 ГЛОВСЕВИЧИ
13.00-13.20 ДЕРЕВЯНЧИЦЫ

25.09.2015
10.00-10.20 ЗЕЛЬВА
10.30-10.50 ДЕРЕЧИН
11.00-11.20 ГОЛЫНКА
11.40-12.10 КОСТРОВИЧИ
12.20-13.00 СЕНЬКОВЩИНА
13.10-13.30 ВАСИЛЕВИЧИ

РЭТРАФОТА



Арыштанты, 1941 год, Слонім

ИЩУ ТЕБЯ

ПРОСЯТ ОТОЗВАТЬСЯ ТЕХ, КТО ЗНАЛ ДОМБРОВСКИХ

Богуслав Домбровский из Польши ищет информацию о Винценте Домбровском (скорее всего, был убит в 1941 году шальной пулей, когда шел по лугу за конем).

Винцент был женат на Александре Домбровской, урожденной Рожковой. Дедушка Пётр Домбровский родился в Забулье в 1908 году. Окончил 9 классов гимназии в Слониме, жил на Коссовском тракте. Женат на Марии Домбровской. Сын Ержи (Григорий) умер от взрыва мины на школьной экскурсии с сыном начальника полка саперов.

Близнецы Ричард и Тадеуш родились в 1944 году, их определили в детский дом, когда их деда забрало НКВД. Дочь Гражина не окончила школу, работала в ткацком цеху. Дедушка Пётр до 19 сентября 1939 года был командиром противовоздушной команды в Слониме. Позже он работал школьным инспектором. Он сотрудничал с АК, за что в 1944 году был взят на Лубянку, а затем отправлен в лагерь в Углич.

Богуслав Домбровский ищет любую информацию о семье. Связаться с Богуславом можно на сайте http://www.radzima.net или через редакцию.

P.S. Уважаемые читатели! Если Вы хотите найти кого-то из своих родных, друзей, знакомых, обращайтесь в нашу рубрику «Ищу тебя». Мы поместим Ваше послание на страницах «ГС», сайте издания и в соцсетях. А также обязательно пишите или звоните нам, если Вам что-то известно о людях, которых ищут в нашей рубрике: тел. 8 029 133-04-21, e-mail zhannapleshko@gmail.com

Наталья ИВАНОВА



Доброе утро, Слоним!

Всем нам приходится иногда быть для кого-то жилеточкой, в которую роняют: «Я никогда ему этого не прощу!..» И часто в этих словах звучит что-то настолько злое, нечеловеческое, а главное, это непрощение съедает обиженного изнутри больше, нежели сама ситуация, случившаяся с ним.

А между тем подобными обидами и непрощением людские сердца вокруг уже перенасыщены. Сердечные раны кровоточат и не заживают. Да и как им зажить, если человек вновь и вновь уязвляет себя горькими воспоминаниями, которые медленно, но верно разрушают его?!

Самое интересное — это интонация в голосе и выражение лица у тех людей, которые говорят: «Есть вещи, которые нельзя простить. И я не прощу это». Ох, и держимся же мы порой за это лезвие в сердце, бережем его днями, годами, а то и всю жизнь. Отпустить? Да нет, лучше болеть, пить пилюли и плакаться в жилетку, но только не простить. А ведь и обида, и злоба может перейти на станцию «привычка» и человек, живущий в своем гордом непрощении, начинает видеть подвох во всем и вся. А оно вам надо?!

Как бы ни было обидно — извините. Даже тогда, когда ваш обидчик настолько узок, что и не понял, что обидел. Простите, прежде всего, для себя. Ведь жить с вечно окровавленной раной невозможно — наше сердце достаточно большое и в то же время маленькое. А передряги всегда были и будут, и одна из побед, которую вы можете одержать над противником, — это превзойти его в вежливости. Но признак самодостаточности все же прощение.

«Прости» и «Прощаю» — это ключи от самых нерушимых стен и цепей, когда чужие вновь становятся родными, близкими и дорогими. Ведь мы же люди, и… хорошие же люди.

Алёна АЛЬКО

АФИША

КИНОТЕАТР «МИР»

19 августа

Зал — «Дальняя дорога», США, драма, сеансы в 18.00 и 20.00

Видеосалон — «Неуловимые», Россия, приключения, сеансы в 16.00, 18.00 и 20.00

20 августа

Зал — «Дальняя дорога», США, драма, сеансы в 18.00 и 20.00

Видеосалон — «Неуловимые», Россия, приключения, сеансы в 16.00, 18.00 и 20.00

21 августа

Зал — «Веселые ребята», Россия, комедия, сеансы в 18.00 и 20.00

Видеосалон — «Неуловимые», Россия, приключения, сеансы в 16.00, 18.00 и 20.00

22 августа

Зал — Детский сеанс «Даша-путешественница», США, мультсериал, начало в 14.00; «Веселые ребята», Россия, комедия, сеанс в 16.00. Детская дискотека, начало в 19.00

Видеосалон — «Неуловимые», Россия, приключения, сеансы в 16.00, 18.00 и 20.00

23 августа

Зал — Детский сеанс «Даша-путешественница», США, мультсериал, начало в 14.00; «Веселые ребята», Россия, комедия, сеансы в 16.00, 18.00, 20.00

Видеосалон — «Неуловимые», Россия, приключения, сеансы в 16.00, 18.00 и 20.00

ДЕТСКИЕ ПЛОЩАДКИ

22 августа

Праздник "Лета жаркая пора — веселится детвора"

Детские площадки возле новых домов на ул. Тополевой, недалеко от "АЛМИ"

Начало праздника в 15.00

ЦЕНТР КУЛЬТУРЫ И ОТДЫХА

26 августа

Концерт Сергея Романова "Приходите в мой дом", начало в 18.30, цена билета 80 000 руб.

4 сентября

Концерт группы «Бяседа», начало в 18.30, цена билета 100 000 руб.

КРАЕВЕДЧЕСКИЙ МУЗЕЙ

28 июля — 30 сентября

Выставка роботов ROBO ART, 10.00-19.00, понедельник выходной, цена билета — 20 000-30 000 руб.

КАЗКА

ПАСЛЯ ДОЖДЖЫКУ Ў ЧАЦВЕР

Неяк сустрэліся Воўк і Заяц.

— Давай заўтра ў грыбы сходзім, — прапанаваў Зайцу Воўк.

— А ты ведаеш, дзе шмат грыбоў нарасло? — запытаўся Заяц у Воўка.

—Ведаю адзін бярозавы лясок! Заўтра рана-раненька прыходзь да мяне. Не праспі! — сказаў Воўк.

— Не прасплю. У мяне будзільнік ёсць. На пяць гадзін раніцы яго пастаўлю, — паведаміў Воўку Заяц. Вельмі хочацца яму першых грыбоў назбіраць.

— Давай дамовімся так, — прамовіў Воўк. — Заўтра я цябе завяду ў грыбы, а ты мяне паслязаўтра завядзеш у суніцы. Усе сунічныя мясцінкі, чуў ад Лісы, ты добра вывучыў.

— Вывучыў, абавязкова завяду, — паабяцаў Заяц і адправіўся дамоў.

Роўна ў пяць гадзін раніцы разбудзіў Зайца будзільнік, на ўсю хату весела зазвінеў.

Заяц ускочыў з ложка, узяў кошык і пабег да Воўка. А таго ўжо і след прастыў. Не пачакаўшы Зайца, панёсся ў грыбны бярозавы лясок.

— Называецца, дамовіліся! — з горкасцю прагаварыў Заяц.

Апаўдні сустрэў ён Воўка. З бярозавага ляска ішоў Воўк з поўным кошыкам крамяных баравічкоў.

Паглядзеў Заяц на баравічкі і цяжка ўздыхнуў. А Воўк не разгубіўся, усклікнуў:

— Усё-ткі праспаў ты, браток!

— У пяць гадзін разбудзіў мяне будзільнік, — пакруціў галавою Заяц.

— Да шасці гадзін я цябе чакаў, — схлусіў Воўк. "Ён нават не пачырванеў, з яго як з гусі вада. Такому нічога не дакажаш", — падумаў Заяц і пакрочыў па сцяжынцы.

— Пачакай, сусед! — гукнуў Воўк. — Заўтра ў суніцы завядзеш. Дамаўляліся!

— Ягады не паспелі, — спыніўшыся, адказаў Заяц.

Воўк разявіў рот.

— А калі яны паспеюць?

— Пасля дожджыку ў чацвер, — прамовіў Заяц і пайшоў.

— Пасля дожджыку ў чацвер, значыць! Трэба пачакаць, — паглядзеўшы ўслед Зайцу, прагаварыў Воўк.

Аляксей ЯКІМОВІЧ

Кроссворд цифровой

Каждой цифре соответствует буква

					1	6	3	7	5	8	12					
					■	1	■	9	■	7	■					
					→ 1	9	12	3	17	8	6					
					■	7	■	19	■	9	■					
					7	8	12	3	4	8	7					
10	■	7	■	10	■	10	■	6	■	7	■	1	■	1	■	↓ 13
1	9	8	17	1	12	■	7	11	12	■	1	20	1	9	11	15
5	■	4	■	13	■	4	■	3	■	11	■	12	■	16	■	12
1	13	8	4	8	16	3	12	■	1	7	7	8	4	1	5	1
12	■	14	■	6	■	19	■	16	■	2	■	17	■	17	■	18
8	14	8	9	7	1	■	19	11	12	■	7	1	7	1	13	8
7	■	7 ↓	■	1	■	13	■	9	■	7	■	12	■	7	■	7
					7	1	9	4	2	8	6 →					
					■	12	■	15	■	9	■					
					7	8	17	6	1	12	1					
					■	7	■	5	■	11	■					
					13	1	4	1	12	7	1					

ОТ ВЛАДИМИРА ВАШУТЫ

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12	13	14	15	16	17	18	19	20

ОПРОС

ПОЧЕМУ СВЕТИТ СОЛНЫШКО?


Как известно, дети в отличие от взрослых почти всегда искренни. Недавно корреспондент «ГС» поинтересовалась у малышей: почему же светит солнышко? И вот какие услышала ответы, за которые не судите их строго.

Милана, 7 лет:




— Солнышко светит, чтобы греть всех. Оно согревает человека и всех остальных. Солнышко появляется, когда наступает утро, а прячется, когда приходит ночь.

Арина, 5 лет:



— Потому, что лето. Солнышко выглядывает с неба. Оно прячется, когда начинается дождь. Солнце боится намокнуть.

Арсений, 5 лет:




— Солнышко светит для птичек, цветочков и для меня.

Ваня, 9 лет:



— Солнце нужно, чтобы росли деревья и растения, а на улице было светло. Я очень люблю, когда светит солнце.

Катюша, 5 лет:



— Светит, чтобы людям освещать дорогу. Солнышко живёт на юге и на востоке. Солнце большое и красивое.

Женя, 8 лет:



— Потому, что сейчас лето. Без солнца ни одно животное, ни растение, ни человек жить не может.

Диана, 3 года:



— Солнышко светит для деток. Оно живёт на небе, а вечером ложится спать. Когда солнышко встаёт, и я встаю.

Екатерина ЯНУШЕВИЧ
Фото автора

Страницу подготовила Екатерина ЯНУШЕВИЧ

Намеснік галоўнага рэдактара
Мікола КАНАНОВІЧ
Журналісты
Уладзімір ШУМЕЛЬ
Яўген ВАЛАДАШЧУК
Кацярына ЯНУШЭВІЧ
Таццяна ДЗЕНІСЮК
Алена КАСЦЮК
Стыль-рэдактар
Жанна ПЛЕШКО
Рэдакцыя сайта www.gs.by
Рэдактар
Дзмітрый МІЦКЕВІЧ
Спецыяліст па рэкламе
Марыя ІЛЬІЧОВА

Галоўны бухгалтар
Святлана ПРЫМАВА
Бухгалтар
Вольга БУРСЕВІЧ
Аддзел падпіскі і продажу
Аляксей НАВІЦКІ
8-(029) 322-06-42
Вёрстка і дызайн
Віталь ЕМЯЛЬЯНАЎ
Сяргей РЭКУН

Тэлефоны рэдакцыі:
т/факс: **8 (01562) 5-09-31,**
Тэл. 6-36-58, 6-36-68, 6-36-54, 6-36-44.
МТС: **8-029-584-87-32**
Velcom: **8-029-133-04-21**
Skype — gazslon
(9.00-18.00)
Для карэспандэнцыі:
231799, г. Слонім,
вул. Чырвонаармейская, д. 41
e-mail: gs@gs.by,
gazslon@gmail.com
© «Газета Слонімская» Спасылка на «ГС» абавязковая

Рэкламная служба
Начальнік рэкламнай службы
Ганна ВАЛАДАШЧУК
anna@gs.by
8-(029) 612-26-43
Супрацоўнікі
Наталля СТРУПАВЕЦ
Людміла КАМЯНЕЦКАЯ
Наталля СЕМЯНОВІЧ
8-(044) 715-90-03
8-(01562) 6-60-56
(9.00–16.00)
т/факс:
8-(01562) 5-09-27
Ⓚ Матэрыялы публікуюцца на правах рэкламы

Прыём аб'яў і падпіска:
г. Слонім, Чырвонаармейская, 73 Б
(будынак АРЗ)
Працуем аўторак — пятніца 9[00]-17[00]
субота — нядзеля 9[00]-15[00]
выхадны — панядзелак
8-(044) 762-48-39

погода на неделю

	утро	день	вечер
СРЕДА, 19 августа	11^0	19^0	20^0
ЧЕТВЕРГ, 20 августа	10^0	21^0	21^0
ПЯТНИЦА, 21 августа	11^0	23^0	22^0
СУББОТА, 22 августа	13^0	25^0	24^0
ВОСКРЕСЕНЬЕ, 23 августа	14^0	26^0	25^0
ПОНЕДЕЛЬНИК, 24 августа	18^0	20^0	17^0
ВТОРНИК, 25 августа	23^0	28^0	20^0
СРЕДА, 26 августа	24^0	28^0	19^0

www.meteoprog.by

«Давай познакомимся»



Хотите встретить свою вторую половинку, но у вас это не получается? «ГС» поможет вам найти друг друга.

Познакомлюсь с порядочным одиноким мужчиной от 55 до 63 лет для дружбы и общения, звонить после 19.00. Тел. 8-033-378-35-46.

Давайте объявление, приносите свои фото с кратким рассказом о себе по адресу: г. Слоним, ул. Красноармейская, 73 Б, тел. для справок 6-60-56, 8-044-762-48-39.

НАШЕ ИНТЕРВЬЮ

СЛОНИМЧАНКА ПОМНИТ КАЖДОГО КОТЁНКА, КОТОРОМУ НАШЛА НОВЫЙ ДОМ

Слонимчанка Ольга Круподёрова пристраивает брошенных животных к добрым людям. Почему она этим занимается и сколько уже пристроила пушистых друзей, об этом сегодня Ольга рассказывает нашим читателям.

— По-другому я уже жить не могу. Животных всех люблю и не могу пройти мимо. Однажды был такой случай. Когда я торопилась на работу, на улице увидела котёнка, но из-за нехватки времени не взяла его. Совесть мне не позволила спокойно работать, я вернулась и забрала малыша домой. Точно не скажу, сколько пристроила. Об этом я никогда не задумывалась, тем более есть категории животных, которые у меня были на передержке. С ними тяжелее всего было, ведь к ним очень сильно привязываешься. А есть те, которые находились у кого-то, а я уже активно делала всё, чтобы пушистики обрели свой дом. Но главное, что я абсолютно все истории по пристройству помню.

— Кто в основном забирает питомцев? И почему люди берут их к себе?

— Точных причин назвать не могу, почему люди берут себе животных. Есть те, у кого пропал питомец или его не стало. Люди стараются взять другое животное, чтобы забыть своего любимца быстрее. Они не представляют жизнь уже без четвероного друга. Другие домашних любимцев берут как игрушку для себя или своих детей. Также есть те, кто хочет приучить детей любить окружающий их мир.

— Как котики и собачки попадают к Вам?

— Чаще всего кто-то из знакомых, друзей просит помочь в поиске надёжных хозяев. Очень часто я нахожу животных на улице. Я думаю, многие находят бездомышей на улице, но люди просто проходят мимо, полагаясь на чужую добродетель.

— Какие животные попадают к Вам на передержку?



Ольга Круподёрова со своим любимцем

— В основном это котята.

— У Вас есть животные?

— У меня два кота, которые тоже привыкли к постоянным передержкам, к новым четвероногим друзьям. У всех моих друзей есть животное дома.

— А были интересные случаи, когда приходилось пристраивать животных?

— Здесь я теряюсь, что рассказать, так как в каждом пристройстве есть что-то интересное. Два года назад, гуляя в городе с подругой, мы нашли котёнка просто посреди пешеходной дорожки. Люди проходили мимо и не обращали на малыша внимания, а он был ещё слепыш. Мы забрали его, отвезли к кормящей кошечке, подкармливали котёнка дополнительно из шприца, потому что у кошки было ещё пять своих котят. Одним словом, выходили. Из котёнка выросла очень красивая кошечка, отдали её хорошим и добрым людям. А теперь, вот уже два года подряд, я помогаю пристраивать очаровательное потомство нашей бывшей подопечной. Но самое главное, что благодаря пристройству у меня появляется много интересных и очень хороших знакомых.

Екатерина ЯНУШЕВИЧ
Фото предоставила Ольга КРУПОДЁРОВА

Дзякуй за тое, што выбралі “Газету Слонімскую”!

Галоўны рэдактар Віктар Уладзіміравіч Валадашчук, victor@gs.by

ЗАСНАВАЛЬНІК **Віктар Уладзіміравіч ВАЛАДАШЧУК**
Газета друкуецца на беларускай і рускай мовах

Рэгістрацыйнае пасведчанне №64 ад 05.03.2009 года. выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Свидетельство о госрегистрации УП "Газета Слонимская" ЮКЛ № 001845, выданное Гродненским областным исполнительным комитетом от 03.04.2003 г.

email: gs@gs.by gazslon@gmail.com
Юрыдычны адрас: 231800, г.Слонім, вул. Чырвонаармейская, 41
Тыраж 4010 экз.

Падпісныя індэксы:
64042 (індывідуальная)
63818 (ведамасная)
63646 (ільготная)
Свабодны кошт

Час падпісання да друку па графіку 18 жніўня 2015 года **16:00**.
Аб'ём — сем умоўных друкаваных аркушаў.

Надрукавана ў друкарні ГАУПП "Гродзенская друкарня" г.Гродна, вул. Паліграфістаў, 4, індэкс 230025.
Заказ № 4776